**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2022 г.**

**<u>Мерапрыемствы да Года гістарычнай памяці, да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь</u>**

У публічных бібліятэках дзейнічалі кніжныя выставы, прысвечаныя Дню Канстытуцыі: «Закон, по которому живём», «Гарант свобод человека», «Знать закон, следовать закону» і г. д. Ва ўсіх бібліятэках раёна афармлены кніжныя вастaвы па тэме генацыду беларускага народа: «И память, и боль на века», «Свет памяти, свет скорби», «Забвению не подлежит» і г. д.

З 29 сакавіка па 3 красавіка ў бібліятэках ДУК стартаваў Тыдзень памяці і смутку «И помнить страшно, и забыть нельзя».

**10 сакавіка**

У рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» прайшла літаратурна-гістарычная гасціная «Женщины в истории: белорусский след», прымеркаваная Году гістарычнай памяці. Навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа пазнаёміліся з выдатнымі жанчынамі ў гісторыі нашай краіны. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэаролікаў «Путь Евфросинии Полоцкой», «О жизни Боны Сфорца» і відэапрэзентацыяй «О женщинах, достойных восхищения».

ЦБ, 52 чал.

**14 сакавіка**

Працаўнікі філіяла «Дзівінская публічная бібліятэка» запрасілі навучэнцаў сярэдняй школы на ўрок грамадзянскасці «Мир права. Конституция Республики Беларусь». Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй прыняцця дакумента, асноўнымі правамі і абавязкамі грамадзянаў, гарантаванымі Канстытуцыяй РБ, прынялі ўдзел у віктарынах «Сказка ложь, да в ней намёк», «Знаешь ли ты государственные праздники?», прагледзелі відэапрэзентацыю «Твои права».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 18 чал.

**16 сакавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры на базе ПЦПІ прайшоў урок грамадзянскасці «Конституция Республики Беларусь: для людей и во имя будущего». У мерапрыемтве прыняў удзел старэйшы памочнік пракурора Кобрынскага раёна Раман Іванавіч Гушчын, які азнаёміў моладзь з занесенымі зменамі і дадаткамі ў Канстытуцыю Беларусі. Юнакі адказвалі на пытанні інтэлектуальна-прававой віктарыны і азнаёміліся з выставай-інфармацыяй «Конституция Республики Беларусь – основа единства нации и сохранения исторической памяти народа».

ЦБ, 88 чал.

**18 сакавіка**

Хідрынская публічная бібліятэка сумесна з працаўнікамі Цэнтра культуры і вольнага часу правялі інфармацыйную гадзіну «Конституция – основной закон Беларуси» для навучэнцаў Хідрынскай СШ. Бібліятэкар правяла бібліяграфічны агляд тэматычнай кніжнай выставы «Беларусь: ад слаўнага мінулага да дастойнай будучыні».

Хідрынская ПБ, 28 чал.

**20 сакавіка**

Залеская публічная бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правялі трэцяе свята-конкурс беларускай паэзіі і песні «Беларуская мова – мелодыя душы». У свяце-конкурсе прынялі ўдзел старшыня Брэсцкага адзялення «Саюза пісьменнікаў Беларусі» Таццяна Анатольеўна Дземідовіч, член саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Пятроўна Кандрашук.

Залеская ПБ, 110 чал.

**24 сакавіка**

У філіяле «Дзіцячая бібліятэка» для вучняў пачатковых класаў СШ №1 г. Кобрына адбыўся час памяці «В их детство ворвалась война». Бібліятэкар паведаміла дзецям аб героях-піянерах нашай краіны, аб іх гераічных подзвігах. Юныя карыстальнікі прагледзелі відэапрэзентацыю «Маленькие герои большой войны». У бібліятэцы аформлена кніжная выстава «Великая Отечественная война в именах и датах».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 36 чал.

## Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага дня

**4 сакавіка**

Вакальная група «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавала вечар-дывертысмент «Весны центробежная сила» для прагожай паловы Брэсцкай абласной арганізацыі БОО «БелТІЗ». Прысутныя на свяце працаўнікі Дзівінскага Цэнтра культуры і вольнага часу, Таццяна Брыштэль, Наталля Пушыла і Алег Сыч, павіншавалі жанчын прыгожымі песнямі са сваёй творчай калекцыі. Прадстаўнік арганізацыі Смеховіч Валянціна Мікалаеўна звярнулася да прысутных са словамі добрых пажаданняў і ўручыла памятныя сувеніры.

*(Кобрин-информ. – 2022. – 10 марта. – С. 3)*

ЦБ, 23 чал.

**9 сакавіка**

У Гарадзецкай публічнай бібліятэцы праведзена забаўляльная праграма «Девичьи премудрости». Бібліятэкар пазнаёміла гасцей з гісторыяй узнікнення свята, прадставіла відэапрэзентацыю «Все о 8 марте», правяла агляд выставы для юных прынцэс «Кто на свете всех милее». Дзяўчыны дружна ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах і віктарынах «Угадай рецепт», «Цветы», «Женские имена от А до Я», «Пословицы о женщинах», «Лечебные

загадки». У атмасферы вясны ўдзельніцам сустрэчы былі ўручаны святочныя прызы.

Гарадзецкая ПБ, 16 чал.

**9 сакавіка**

Для ўдзельнікаў аматарскага клуба «Каласок» Тевельская публічная бібліятэка правяла шоў-праграму «А ну-ка, девочки!». Бібліятэкар расказала пра гісторыю ўзнікнення Міжнароднага жаночага дня. Без запінак усе дзяўчынкі адказалі на пытанні інтэлектуальнага конкурсу «Самые сообразительные», прынялі ўдзел ў гульнявых конкурсных праграмах: «Поэтический», «Хозяюшки» і «Рукодельницы», «Фотомодель».

Тэвельская ПБ, 17 чал.

**12 сакавіка**

«Музыку жизни мы вам посвящаем» – пад такой назвай прайшло музычнае асарці, прысвечанае 35-годдзю стварэння Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў. На мерапрыемства запрошаны ветэраны працы аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзянаў сталага веку ДУ «ТЦСАН». Прыемным падарункам для гасцей свята стала канцэртавая праграма, падрыхтаваная вакальнай групай «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, музычныя нумары Людмілы Ігнацюк і Людмілы Боцех.

ЦБ, 22 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**9 сакавіка**

У рамках інфармацыйна-асветніцкага праекта «Здоровая молодежь – здоровая нация» для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа прайшла інфармацыйная гадзіна «В рабстве безумия», прысвечаная праблеме залежнасцяў у моладзевым асяроддзі. Прысутныя праслухалі лекцыю ўрача па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святланы Васільевай, прагледзелі відэаролік «Предупреждение». У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры аформлена кніжная выстава «Соблазн велик, но жизнь дороже».

ЦБ, 58 чал.

**9 сакавіка**

У рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество» супрацоўнікі натарыяльнай канторы Надзея Іванаўна Дашук, Святлана Аляксееўна Зарэцкая правялі бясплатную прававую кансультацыю. Натарыусам Святланай Зарэцкай для моладзі праведзены лекцыйны занятак.

*(Кобрин-информ. – 2022. – 10 марта. – С. 3)*

ЦБ, 14 чал.

**13 сакавіка**

У Імянінскай публічнай бібліятэцы пасяджэнне аматарскага клуба «Жывіца» прайшло ў фармаце эколага-пазнавальнага часу «Всегда и везде человек нуждается в воде». Бібліятэкар расказала дзецям аб рэках і азёрах

Беларусі, аб рыбах і жывёлах, якія насяляюць вадаёмы. Для нагляднасці мерапрыемства суправаджалася электроннай прэзентацыяй «Реки и озера Беларуси». Дзеці актыўна адказвалі на пытанні віктарыны «Кто? Где? Когда?» і атрамалі салодкія падарункі.

Імянінская ПБ, 12 чал.

**19 сакавіка**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо» прайшло ў фармаце літаратурнай лабараторыі «Пішам для дзяцей». Аздобілі мерапрыемства прэзентацыі трох кніг: «Шахматные ступеньки» Сцяпана Давыдзюка, «Английский – через рифмы» Алены Котавай і літаратурнага альманаха «Лірычны настрой», у якім змешчаны творы чатырнаццаці членаў клуба.

ЦБ, 9 чал.

**22 сакавіка**

Кіраўнік літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Кобрынскай цэнтральнай раённай біблітэкі Наталля Ефціфеева (Кандрашук) у якасці дэлегата прыняла ўдзел у рабоце XXV с’езда Союза пісьменнікаў Беларусі.

200 чал.

**25 сакавіка**

Члены літаратурнага клуба «ПаэтыКо» на чале з кіраўніком Наталляй Ефціфеевай (Кандрашук) выступілі на пляцоўцы Саюза пісьменнікаў Беларусі на XXIX Мінскай міжнароднай выстаўцы-кірмашы. Яны не толькі чыталі свае вершы, але і прэзентавалі гледачам новыя кнігі: «Английский – через рифмы» Алены Котавай і літаратурны альманах «Лірычны настрой», у якім змешчаны творы чатырнаццаці членаў клуба.

135 чал.

Вакальная група «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прадставіла дакументы да ўдзелу ў XXX рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы».

*(Заря. – 2022. – 12 сакавіка. – С. 10)*

ЦБ

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

Метадыстамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу выдадзены метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі працы ў Год гістарычнай памяці «Истории славной священные даты» і інструктыўныя матэрыялы па арганізацыі мерапрыемстваў па тэме «Геноцид белорусского народа».

Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавана інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Першая “Школа міру” на Брэстчыне», якое працягвае цыкл паказальнікаў з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне».

Зыбайла К. І.
Тэл. 3 85 81